УДК 930.2+94(47).084.9

**Я. І. Завацкі**
Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт

# ДАКУМЕНТЫ XXVII І XXVIII З’ЕЗДАЎ КПСС І XIX УСЕСАЮЗНАЙ КАНФЕРЭНЦЫІ КПСС ЯК КРЫНІЦЫ ПА ВЫВУЧЭННІ ДЗЯРЖАЎНАЙ ЭКАЛАГІЧНАЙ ПАЛІТЫКІ Ў СССР У ПЕРЫЯД ПЕРАБУДОВЫ

Мэта дадзенай працы – выявіць захады з боку савецкага кіраўніцтва па аптымізацыі дзяржаўнай палітыкі па ахове навакольнага асяроддзя і прыродакарыстання на мяжы 1980–1990-х гг. у адпаведнасці з дакументамі, прынятымі КПСС на XXVII і XXVIII з’ездах і на XIX Усесаюзнай канферэнцыі. У артыкуле звяртаецца ўвага, што дзяржаўная прыродаахоўная палітыка ў СССР у гады перабудовы прайшла ў некалькі этапаў, для якіх было характэрна разгортванне шэрагу хваляў дэмакратызацыі ў жыцці савецкага грамадства. Перабудовачныя працэсы адбіліся на лібералізацыі палітычнай сістэмы, пераводзе народнай гаспадаркі да рэгуляванага рынку, пашырэнні правоў савецкіх рэспублік. Навізна разглядаемай працы заключаецца ў сістэмным аналізе дакументаў КПСС па перабудове дзяржаўнай сістэмы кіравання прыродааховай. Падобная спроба зроблена ўпершыню ў гістарыяграфіі.

Прынятыя на XXVII, XXVIII з’ездах і XIX Усесаюзнай канферэнцыі дакументы садзейнічалі павышэнню чалавечага фактару ва ўсіх сферах грамадскага жыцця ў краіне, у тым ліку і ў дачыненні да экалагічных пытанняў. Аднак паражэнне жнівеньскага путчу 1991 г. прывяло ў рэшце рэшт да забароны КПСС і згортвання далёкасяжнага плана дзеянняў па перабудове ўзмаемаадносін паміж саюзным Цэнтрам і складаючымі яго савецкімі рэспублікамі.

**Ключавыя словы:** навакольнае асяроддзе, экалагічная палітыка, КПСС, перабудова, крыніцы.

**Для цытавання:** Завацкі Я. І. Дакументы XXVII і XXVIII з’ездаў КПСС і XIX Усесаюзнай канферэнцыі КПСС як крыніцы па вывучэнні дзяржаўнай экалагічнай палітыкі ў СССР у перыяд перабудовы // Труды БГТУ. Сер. 6, История, философия. 2022. № 1 (257). С. 83–87.

**Ya. I. Zavatski**
Belarusian State University

# DOCUMENTS OF THE XXVII AND XXVIII CONGRESSES OF THE CPSU AND THE XIX ALL-UNION CONFERENCE OF THE CPSU AS SOURCES FOR THE STUDY OF STATE ENVIRONMENTAL POLICY IN THE USSR DURING PERESTROIKA

The purpose of this work is to identify measures taken by the Soviet leadership to optimize the state policy on environmental protection and nature management on the border of the 1980s and 1990s in accordance with the documents adopted by the CPSU at the XXVII and XXVIII congresses and at the XIX All-Union Conference. The article draws attention to the fact that the state environmental policy in the USSR during the years of perestroika took place in several stages, which were characterized by the deployment of a number of waves of democratization in the life of Soviet society. The perestroika processes affected the liberalization of the political system, the transfer of the national economy to a regulated market, and the expansion of the rights of the Soviet republics. The novelty of the work under consideration lies in the systematic analysis of the documents of the CPSU on the restructuring of the state system of environmental protection management. Such an attempt was made for the first time in historiography.

The documents adopted at the XXVII and XXVIII congresses and the XIX All-Union conference contributed to the increase of the human factor in all spheres of public life in the country, including in relation to environmental issues. However, the defeat of the August 1991 putsch eventually led to the ban of the CPSU and the curtailment of a far-reaching action plan for the restructuring of relations between the Union center and its constituent Soviet republics.

**Keywords:** environment, environmental policy, CPSU, perestroika, sources.

**For citation:** Zavatski Ya. I. Documents of the XXVII and XXVIII congresses of the CPSU and the XIX All-Union conference of the CPSU as sources for the study of state environmental policy in the USSR during perestroika. *Proceedings of BSTU, issue 6, History, Philosophy*, 2022, no. 1 (257), pp. 83–87 (In Belarusian).

**Уводзіны.** Савецкая прыродаахоўная палітыка ў гады перабудовы была накіравана на трансфармацыю адносін у сістэме «чалавек – грамадства – навакольнае асяроддзе» з мэтай падтрымання якасных умоў экалагічнай абстаноўкі і забеспячэння рацыянальнага прыродакарыстання. Гэта ж мэта павінна была стаць базісам дзяржаўнага кіравання аховай навакольнага асяроддзя [1, с. 8].

Да сакавіка 1990 г. манаполіяй на ўладу ў СССР валодала кампартыя, таму прынятыя партыйным кіраўніцтвам краіны дакументы павінны былі служыць пуцяводнай зоркай у жыцці і дзейнасці савецкага грамадства. Перавод Савецкага Саюза на рэйкі новай палітычнай і эканамічнай мадэлі і ўзмацненне ролі асобна ўзятага чалавека прымусілі правячую эліту па-іншаму зірнуць на сферу навакольнага асяроддзя і на праблему ўплыву на яе. Галоўным тормазам на шляху перабудовы дзяржаўнага кіравання стала працяглае дамінаванне камандна-адміністрацыйнай сістэмы, якая абярнулася кантролем савецкай эканомікі з боку дзяржавы, выцісканнем прыватнай ініцыятывы, дэфармацыяй пачуцця адказнасці і беражлівасці за маёмасць краіны, у тым ліку і прыродных рэсурсаў. У гэтай сувязі паўстала задача перабудаваць мысленне кіраўнікоў прадпрыемстваў, арганізацый і дзяржаўных органаў і іх падначаленых, надаць вагу Саветам народных дэпутатаў усіх узроўняў з мэтай павышэння іх адказнасці на падведамнай тэрыторыі, перавесці прадпрыемствы на гаспадарчы разлік і самафінансаванне, што дало б ім больш свабоды на распараджэнне сваім прыбыткам і на мадэрнізацыю вытворчасці, перагледзець паўнамоцтвы саюзнага Цэнтра і савецкіх рэспублік на карысць апошніх. На вырашэнне ўсіх адзначаных праблем былі накіраваны дакументы XXVII і XXVIII з’ездаў КПСС і XIX Усесаюзнай партыйнай канферэнцыі.

**Асноўная частка.** На момант абрання М. Гарбачова Генеральным сакратаром ЦК КПСС яму дасталася ў спадчыну эканоміка, якая ўяўляла сабой адзіны ваенна-прамысловы комплекс. Аднак камандна-адміністрацыйны падыход, на якім грунтавалася савецкая мадэль гаспадарання, не ствараў стымулаў ні для тэхнічнага прагрэсу, ні для зберажэння матэрыяльных і працоўных рэсурсаў, ні для задавальнення попыту людзей. Акрамя гэтага, новы генсек атрымаў у спадчыну грамадства, якое было маральна спустошана шматгадовым таталітарным панаваннем і ў чыіх пластах шырока распаўсюдзіліся апатыя, бяздзейнасць і безадказнасць [2, с. 282].

Апагеем стратэгічнага курсу першага этапу кіравання М. Гарбачова з’явіўся XXVII з’езд КПСС, які адбыўся 25 лютага – 6 сакавіка 1986 г. [2, с. 285]. Экалагічныя захады, прадугледжаныя з’ездам, былі прапісаны ў трэцяй рэдакцыі Праграмы КПСС 1961 г. і Асноўных накірунках эканамічнага і сацыяльнага развіцця СССР на 1986–1990 гг. і на перыяд да 2000 г. [3, 4]

Трэцяя рэдакцыя Праграмы КПСС 1961 г. дэкларавала кардынальнае паскарэнне навукова-тэхнічнага прагрэсу, які павінен быў забяспечыць інтэнсіўнае паляпшэнне выкарыстання карысных выкапняў, сыравіны, матэрыялаў, паліва і энергіі ад іх здабычы і комплекснай перапрацоўкі да выкарыстання канчатковай прадукцыі. Пры гэтым ставілася мэта задаволіць прырост эканамічных патрэб за кошт рэсурсазберажэння [3, с. 5].

Праблема аховы навакольнага асяроддзя і рацыянальнага выкарыстання прыродных рэсурсаў закраналася ў раздзеле XI Асноўных накірункаў эканамічнага і сацыяльнага развіцця СССР на 1986–1990 гг. і на перыяд да 2000 г. Дадзеным дакументам прадугледжвалася больш шырокае ўкараненне малаадходных і безадходных тэхналагічных працэсаў, якія забяспечылі б павышэнне эфектыўнасці мерапрыемстваў па ахове прыроды. Таксама ў раздзеле Асноўных накірункаў рабіўся акцэнт на развіцці камбінаваных вытворчасцей, якія забяспечылі б поўнае і комплекснае выкарыстанне матэрыялаў, карысных выкапняў і сыравіны, прадухілілі б ці істотна панізілі б шкоднае ўздзеянне на экалогію.

Напрыканцы раздзела XI дакумента заяўлялася аб павышэнні эфектыўнасці дзяржаўнага кантролю за станам экалогіі і крыніцамі забруджвання, удасканаленні кіравання справай аховы прыроды ў краіне, пашырэнні формаў і метадаў грамадскіх арганізацый і насельніцтва ў гэтай справе, выхаванні ў савецкіх людзей пачуцця адказнасці за захаванне, прымнажэнне і беражлівае выкарыстанне прыродных рэсурсаў [4, с. 5].

Раздзел XIV Асноўных накірункаў быў прысвечаны ўдасканаленню кіравання народнай гаспадаркай. У ім ставілася задача пашырыць правы Саветаў Міністраў саюзных і аўтаномных рэспублік, павысіць іх адказнасць за вырашэнне пытанняў сацыяльна-эканамічнага развіцця. Яны павінны былі адыгрываць больш значную ролю пры забеспячэнні комплекснага развіцця народнай гаспадаркі на падведамнай тэрыторыі, рацыянальным выкарыстанні працоўных, сыравінных і паліўна-энергетычных рэсурсаў. Пры гэтым планавалася, каб даходы мясцовых бюджэтаў у большай ступені залежалі ад вынікаў гаспадарчай дзейнасці аб’яднанняў, арганізацый і прадпрыемстваў, размешчаных на канкрэтнай тэрыторыі [4, с. 6].

Падчас другога этапу перабудовы, які распачаўся ў 1987 г., была прапанавана новая канцэпцыя і стратэгія рэформ. Калі раней меркавалася, што савецкая мадэль сацыялізму ў аснове сваёй здаровая і патрэбна толькі «паскарэнне» яе развіцця, то зараз намаганні былі накіраваны на

стварэнне новай мадэлі – дэмакратычнага сацыялізму.

Апафеозу другі этап перабудовы дасягнуў падчас правядзення XIX Усесаюзнай канферэнцыі КПСС (28 чэрвеня – 1 ліпеня 1988 г.), якая прайшла пад лозунгамі галоснасці, дэмакратызацыі і тэхнічнага перааснашчэння эканомікі. Упершыню на канферэнцыі быў абвешчаны курс на будаўніцтва прававой дзяржавы, якая засноўвалася б не на волі правячай эліты, а на законе [2, с. 305–307].

Разглядаемая партыйная канферэнцыя адметная прыняццем шэрагу рэзалюцый, дзе закраналіся захады па ахове навакольнага асяроддзя. У рэзалюцыі «Аб ходзе рэалізацыі рашэнняў XXVII з’езда КПСС і задачах па паглыбленні перабудовы» падкрэслівалася, што канферэнцыя лічыла безумоўна важнейшай задачай паляпшэнне экалагічнай сітуацыі ў краіне. Эфектыўнасць усіх мерапрыемстваў у гэтай сферы павінна была быць у значнай ступені паднятая за кошт метадаў гаспадарчага стымулявання і навейшых дасягненняў навукова-тэхнічнага прагрэсу [5, с. 1].

Рэфармаванне дзяржаўнага ладу СССР прадугледжвала рэзалюцыя «Аб міжнацыянальных стасунках». У ёй вялася размова аб пашырэнні правоў саюзных і аўтаномных рэспублік з дапамогай размежавання кампетэнцыі саюзнага цэнтра і савецкіх рэспублік, дэцэнтралізацыі, перадачы на месцы некаторых кіраўніцкіх функцый, узмацнення адказнасці і самастойнасці ў галіне эканомікі, сацыяльнага і культурнага развіцця, аховы навакольнага асяроддзя [6, с. 3].

У рэзалюцыі «Аб галоснасці» чырвонай рысай праходзіла думка аб пашырэнні галоснасці на ўсіх стадыях дзейнасці органаў дзяржаўнай улады, вывучэнні і ўліку грамадскага меркавання, практыцы публічнага абмеркавання агульнадзяржаўных і рэгіянальных праблем, у тым ліку тых, якія тычыліся экалогіі. Рэзалюцыя падтрымлівала неабходнасць пераадолець практыку неабгрунтаванага скажэння статыстычнай інфармацыі аб сацыяльна-эканамічным і палітычным развіцці грамадства, экалагічнай сітуацыі [7, с. 3].

Рэзалюцыя «Аб прававой рэформе» прадугледжвала кардынальны перагляд, кадыфікацыю і сістэматызацыю заканадаўства. Істотныя змяненні павінны былі закрануць заканадаўства аб ахове навакольнага асяроддзя [8, с. 3].

Трэці этап перабудовачных працэсаў характарызаваўся іх выхадам з-пад кантролю «зверху», старт чаму быў пакладзены правядзеннем адносна свабодных выбараў народных дэпутатаў СССР вясной 1989 г. Пачынаючы з сакавіка 1990 г., палітыка перабудовы ўступіла ў апошнюю чацвёртую фазу свайго разгортвання, якая характарызавалася яе крызісам [9, с. 459]. Адмена 6-га артыкула Канстытуцыі СССР у сакавіку 1990 г. прывяла да перадачы рэальных паўнамоцтваў ад рэгіянальных партыйных камітэтаў да абіраных электаратам Саветаў народных дэпутатаў. Па сутнасці, адмена дадзенага артыкула разбурала станавы хрыбет камуністычнага праўлення і створанага ім у краіне палітычнага рэжыму. Дадзены акт ліквідаваў юрыдычныя падставы на адбор кампартыяй дзяржаўнай адміністрацыі і вызваляў з-пад кантролю Палітбюро ЦК КПСС эліты на месцах [2, с. 345].

У сувязі з вышэйадзначанай тэндэнцыяй слушнай сярод кіраўніцтва СССР з’яўлялася думка аб заключэнні новай Саюзнай дамовы. М. Гарбачоў быў перакананы, што дзеля выратавання Саюза яго трэба было рэфармаваць, рэзка павялічыўшы самастойнасць рэспублік і пакінуўшы за цэнтрам толькі аддадзеныя імі агульныя функцыі [2, с. 350–351].

2–13 ліпеня 1990 г. прайшоў XXVIII з’езд КПСС, на якім была прынята Праграмная заява «Да гуманнага, дэмакратычнага сацыялізму». Стратэгічным падмуркам сваёй палітыкі разглядаемы з’езд аб’явіў «паслядоўны курс на абнаўленне грамадскай сістэмы ў рамках сацыялістычнага выбару» [10, с. 1]. Распрацоўшчыкі праграмнай заявы ўяўлялі гуманны, дэмакратычны сацыялізм у якасці грамадства, у якім на аснове розных форм уласнасці і гаспадарання забяспечваліся найлепшыя ўмовы ў тым ліку для рацыянальнага прыродакарыстання. Праграма дзеянняў КПСС прадугледжвала на працягу 1,5–2 гадоў у сацыяльна-эканамічнай галіне аказаць экстранную дапамогу рэгіёнам экалагічнага і стыхійнага бедства, стварэнне эфектыўных інструментаў стымулявання прыродаахоўнай дзейнасці. У галіне эканомікі партыя выступіла за пераход ад камандна-адміністрацыйнай сістэмы да рынку. Падтрымліваючы паэтапны пераход да рынкавай эканомікі, партыя лічыла неабходным накіраваць дзяржаўнае рэгуляванне новых эканамічных адносін на ажыццяўленне навукова-тэхнічных і экалагічных праграм.

Характарызуючы Саюз суверэнных рэспублік, які меркавалася ў будучыні стварыць, партыя выступіла за дэмакратызацыю ўзаемаадносін паміж народамі і нацыянальна-дзяржаўнымі ўтварэннямі СССР. КПСС абяцала ажыццяўляць курс па ўмацаванні суверэнітэту саюзных рэспублік. Яна прапаноўвала палітычную і прававую разнастайнасць сувязей паміж рэспублікамі і Саюзам у цэлым, шматварыянтнасць іх эканамічных узаемаадносін на аснове гаспадарчай самастойнасці прадпрыемстваў.

Уздымаючы пытанне нацыянальнай палітыкі, партыя лічыла важным забяспечваць спрыяльныя ўмовы для развіцця ўсіх нацый і народнасцей. Гэта тычылася тэрміновых захадаў, уключаючы экалагічнага характару, якія садзейнічалі б падтрыманню асяроддзя пражывання [10, с. 1, 3].

**Заключэнне.** Рэформа дзяржаўнага кіравання аховай навакольнага асяроддзя, пераход да пераважна эканамічных метадаў прыродаахоўнай дзейнасці, зацвярджэнне прыярытэту тэрытарыяльнага кіравання ў сферы аховы і рацыянальнага прыродакарыстання здолелі б пераадолець многія фактары, якія адмоўна ўплывалі на эфектыўнасць прыродаахоўнай дзейнасці ў савецкіх рэспубліках, стварыць сапраўдныя перадумовы для максімальна поўнага ажыццяўлення на месцах паўнамоцтвах па павышэнні якасці навакольнага асяроддзя [1, с. 59–60].

Радыкальная перабудова сістэмы прыродааховы прадугледжвала на справе, а не на словах, пашырэнне паўнамоцтваў саюзных рэспублік і іх кіруючых органаў у сферы аховы навакольнага асяроддзя. Экалагічныя праблемы – гэта, галоўным чынам, рэспубліканскія праблемы, таму адпаведна яны павінна былі быць вырашаны ў рэспубліках з максімальным улікам існуючай спецыфікі. Адсюль і паўстала актуальнасць усталяваць рэальны прыярытэт рэспубліканскага кіравання ў пытаннях аховы прыроды [1, с. 15].

Узмацненне ролі савецкіх рэспублік ставілася ў Асноўных накірунках эканамічнага і сацыяльнага развіцця СССР на 1986–1990 гг. і на перыяд да 2000 г., рэзалюцыі XIX Усесаюзнай партыйнай канферэнцыі «Аб міжнацыянальных стасунках», Праграмнай заяве XXVIII з'езда КПСС «Да гуманнага, дэмакратычнага сацыялізму» [4, 8, 13].

Ва ўмовах пераводу прадпрыемстваў на гаспадарчы разлік і самафінансаванне, дэмакратызацыі палітычнай сістэмы была пастаўлена задача пераходу ад адміністрацыйных да эканамічных метадаў кіравання дзейнасцю па ахове прыроды [1, с. 14]. На гэта былі нацэлены Асноўныя накірункі эканамічнага і сацыяльнага развіцця СССР на 1986–1990 гг. і на перыяд да 2000 г., рэзалюцыі XIX Усесаюзнай партыйнай канферэнцыі «Аб ходзе рэалізацыі рашэнняў XXVII з'езда КПСС і задачах па паглыбленні перабудовы», Праграмная заява XXVIII з'езда КПСС «Да гуманнага, дэмакратычнага сацыялізму» [4, 6, 7, 13].

Удасканаленне дзяржаўнага кіравання аховай навакольнага асяроддзя было звязана з выпрацоўкай у савецкіх людзей пачуцця адказнасці за захаванне і прымнажэнне прыродных багаццяў, сваім асабістым дачыненнем да вырашэння экалагічных праблем, павышэннем узроўню экалагічнай і эколага-прававой культуры [1, с. 25]. Вырашэнню дадзенай задачы павінны былі пасадзейнічаць Асноўныя накірункі эканамічнага і сацыяльнага развіцця СССР на 1986–1990 гг. і на перыяд да 2000 г. [4].

## Спіс літаратуры

1. Государственное управление охраной окружающей среды в союзной республике / Ю. С. Шемшученко [и др.]. Киев: Наукова думка, 1990. 280 с.
2. История России. XX век. В 3 т. Т. 3: Деградация тоталитарного государства и движение к новой России (1953–2008) / А. Б. Зубов [и др.]. Москва: Эксмо, 2017. 688 с.
3. Программа Коммунистической партии Советского Союза: новая редакция. Принята XXVII съездом КПСС // Советская Белоруссия. 1986. № 57–58. 7 марта. С. 3–8.
4. Основные направления экономического и социального развития СССР на 1986–1990 годы и на период до 2000 года // Советская Белоруссия. 1986. № 60. 9 марта. С. 1–6.
5. Резолюции XIX Всесоюзной конференции КПСС: О ходе реализации решений XXVII съезда КПСС и задачах по углублению перестройки // Советская Белоруссия. 1988. № 154. 5 июля. С. 1.
6. Резолюции XIX Всесоюзной конференции КПСС: О межнациональных отношениях // Советская Белоруссия. 1988. № 154. 5 июля. С. 3.
7. Резолюции XIX Всесоюзной конференции КПСС: О гласности // Советская Белоруссия. 1988. № 154. 5 июля. С. 3.
8. Резолюции XIX Всесоюзной конференции КПСС: О правовой реформе // Советская Белоруссия. 1988. № 154. 5 июля. С. 3.
9. История России. XX век: учеб. пособие / В. И. Меньковский [и др.]. Минск: РИВШ, 2005. 704 с.
10. К гуманному, демократическому социализму: программное заявление XXVIII съезда КПСС // Советская Белоруссия. 1990. № 166. 17 июля. С. 1, 3.

## References

1. Shemshuchenko Yu. S., Malysheva N. R., Erofeev N. I. [et al.] *Gosudarstvennoye upravleniye okhranoy okruzhayushchey sredy v soyuznoy respublike* [State administration of environmental protection in the union republic]. Kiev, Naukova dumka Publ., 1990. 280 p. (In Russian).
2. Zubov A. B., Kara-Murza A. A., Kolosov V. A. [et al.] *Istoriya Rossii. XX vek. V 3 t. T. 3: Degradatsiya totalitarnogo gosudarstva i dvizheniye k novoy Rossii (1953–2008)* [The history of Russia. XX century. In 3 vols. Vol. 3: The degradation of the totalitarian state and the movement towards a new Russia (1953–2008)]. Moscow, Eksmo Publ., 2017. 688 p. (In Russian).

3. The Program of the Communist Party of the Soviet Union: new edition. Adopted by the XXVII Congress of the CPSU. *Sovietskaya Belorussiya* [Soviet Belorussia], 1986, no. 57–58, April 7, pp. 3–8 (In Russian).

4. The main directions of economic and social development of the USSR for 1986–1990 and for the period up to 2000. *Sovietskaya Belorussiya* [Soviet Belorussia], 1986, no. 60, March 9, pp. 1–6 (In Russian).

5. Resolutions of the XIX All-Union conference of the CPSU: About the implementation of the decisions of the XXVII Congress of the CPSU and the tasks for deepening perestroika. *Sovietskaya Belorussiya* [Soviet Belorussia], 1988, no. 154, July 5, p. 1 (In Russian).

6. Resolutions of the XIX All-Union conference of the CPSU: About inter-ethnic relations. *Sovietskaya Belorussiya* [Soviet Belorussia], 1988, no. 154, July 5, p. 3 (In Russian).

7. Resolutions of the XIX All-Union conference of the CPSU: About publicity. *Sovietskaya Belorussiya* [Soviet Belorussia], 1988, no. 154, July 5, p. 3 (In Russian).

8. Resolutions of the XIX All-Union conference of the CPSU: About legal reform. *Sovietskaya Belorussiya* [Soviet Belorussia], 1988, no. 154, July 5, p. 3 (In Russian).

9. Men’kovskiy V. I., Yanovskiy O. A., Poznyak S. V. [et al.] *Istoriya Rossii. XX vek: ucheb. posobie* [History of Russia. XX century: Textbook]. Minsk, RIVSH Publ., 2005. 704 p. (In Russian).

10. Towards humane, democratic socialism: the Program statement of the XXVIII congress of the CPSU. *Sovietskaya Belorussiya* [Soviet Belorussia], 1990, no. 166, July 17, pp. 1, 3 (In Russian).

## Інфармацыя пра аўтара

**Завацкі Яўген Ігаравіч** – магістр гістарычных навук, аспірант кафедры гісторыі Беларусі новага і навейшага часу. Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт (220006, г. Мінск, пр-т Незалежнасці, 6, Рэспубліка Беларусь). E-mail: zawadzki1996jauhien@mail.ru

## Information about the author

**Zavatski Yauhen Iharavich** – Master of History Science, PhD student, the Department of Modern and Contemporary History of Belarus. Belarusian State University (6, Nezavisimosti Ave., 220006, Minsk, Republic of Belarus). E-mail: zawadzki1996jauhien@mail.ru

*Пастуніў 14.02.2022*